Ogłoszenia parafialne

Boże Narodzenie 1 niedziela

26 grudnia 2021

на нядзелю 26. 12. 2021.

1. У панядзелак – свята св. Яна, апостала і евангеліста (благаслаўленне віна).
2. У аўторак - свята святых Немаўлят, мучанікаў (благаслаўленне дзяцей).
3. У сераду (29.12) у Доме Культуры а 12.00 адбудзецца каляднае спатканне для дзяцей і моладзі а таксама уручэнне ўзнагарод за конкурс малюнкаў і сямейных стаенак.
4. 30 снежня біскуп Віцебскі Алег Буткевіч удзеліць сакрамэнт пасвячэння ў ступені прэзбітэрату дыякану Валерыю Пупкевічу SCJ, які паходзіць з Паставаў. Урачыстасць святарскага пасвячэння адбудзецца ў касцёле святога Антонія Падуанскага ў 10.00. У нашай капліцы будзе цэлебраваць святую Імшу з благаслаўленнем прымітыйным у нядзелю 2 студзеня а 15-й гадзіне.
5. 1 студзеня – Урачыстасць Святой Багародзіцы Марыі. Дзень малітвы аб супакоі ў свеце. Св. Імша ў 11.00 і 15.00.
6. На дошцы аб’яў, а таксама на парафіяльным сайце расклад душпастырскай візітацыі (каляды).
7. Дзякую за складзеныя ахвяры.